**Прыгодзіч Дар’я Ігараўна**

*Музей гісторыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (Мінск, Беларусь)*

# ЗНАЧЭННЕ ЎНІВЕРСІТЭЦКАГА МУЗЕЯ Ў ПРАЦЭСЕ СТАНАЎЛЕННЯ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ БССР У МІЖВАЕННЫ ПЕРЫЯД

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў сістэме вышэйшай школы БССР адбыліся глабальныя трансфармацыйныя працэсы. Вышэйшыя навучальныя ўстановы (ВНУ) ствараліся і дзейнічалі як цэнтры адукацыі, навукі, асветы і культуры нацыянальнага значэння, галоўнай мэтай якіх была падрыхтоўка навукова-педагагічнай і культурнай эліты. Як і ў розных універсітэтах свету, так і ў ВНУ БССР для ажыццяўлення навуковай, вучэбнай і асветніцкай дзейнасці ствараліся музеі рознага профілю, з мэтай забеспячэння адукацыйнага працэсу наглядным матэрыялам. Як адзначала доктар педагагічны навук Н.К. Крупская: «Музеі вытворчыя, тэхнічныя, прыродазнаўчыя, краязнаўчыя, геаграфічныя і іншыя павінны мець на ўвазе, перш за ўсё прапаганду асноў навукі, сувязь тэорыі з практыкай, павінны сачыць за развіццём навукі, за яе дасягненнямі, паказваць канкрэтна гэтыя дасягненні, пашыраць гарызонт наведвальнікаў, прывіваць цікавасць да навукі» [5, с. 553].

Пачынаючы з 1919 г. дзейнасць як саміх навучальных устаноў, так і музеяў падпарадкоўвалася Народнаму камісарыяту асветы СССР і БССР і рэгулявалася іх рашэннямі, у якіх быў вызначаны статус дадзеных музеяў, як самастойных «устаноў з усімі, уласцівымі музею асаблівасцямі», але «круг тэматыкі, асноўная экспанатура і форма працы такога музея павінны быць абумоўлены напрамкамі дзейнасці навучальнай установы» [15, с. 199–200].

З канца 20-х гг. XX ст. ажыццяўлялася ўкараненне новай ідэалогіі маладой Савецкай дзяржавы, праводзілася жорсткая калектывізацыя і індустрыялізацыя, рэарганізоўвалася сама сістэма вышэйшай школы, ствараліся самастойныя інстытуты на базе факультэтаў ВНУ ва ўмовах недахопу фінансавых і матэрыяльна-тэхнічных рэсурсаў. Гэта выклікала шэраг праблем у забеспячэнні вышэйшай школы кваліфікаваным прафесарска-выкладчыцкім складам, навучальнымі памяшканнямі, лабараторыямі, а таксама бібліятэкамі і музеямі, цэнтрамі ідэалагічнай выхаваўчай працы новай савецкай улады.

Спачатку 1930-х гг. выходзіць Пастанова Савета Народных Камісараў (СНК) РСФСР ад 3 ліпеня 1931 г. «Аб рэарганізацыі дзяржаўных універсітэтаў» [13], у якой паказвалася, што ВНУ павінны быць умацаваны і пашыраны, і што асноўнай задачай універсітэтаў з'яўляецца падрыхтоўка кадраў даследчыкаў і педагогаў для вышэйшай і сярэдняй школы. Пастанова паклала пачатак умацаванню і пашырэнню ўніверсітэцкай адукацыі. Падмацавала яе Пастанова СНК СССР і ЦК ВКП(б) ад 23 чэрвеня 1936 г. «Аб рабоце вышэйшых навучальных устаноў і пра кіраўніцтва вышэйшай школай» [12], у якой былі вызначаны цэнтральныя напрамкі павышэння ідэйна-тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі спецыялістаў.

Паралельна з заканадаўчымі актамі аб вышэйшай школе выходзяць пастановы па арганізацыі музейнай справы. У адпаведнасці з Пастановай УЦВК і СНК РСФСР ад 20 жніўня 1928 г. «Аб музейным будаўніцтве ў РСФСР» [11] быў праведзены шэраг мерапрыемстваў, накіраваных на паляпшэнне работы музея: пашырана навукова-даследчая работа музеяў,

праца па гісторыі навукі, гісторыі тэхнікі, асваенню працаўнікамі культурнай спадчыны мінулага і інш. Аднак, у сілу выяўленых недахопаў, напрыклад, адсутнасці неабходнай сувязі музеяў з навучальнымі ўстановамі і навукова-даследчымі інстытутамі, была прынята Пастанова УЦВК ад 1 студзеня 1934 г. «Аб стане і задачах музейнага будаўніцтва» [14]. Дакумент таксама садзейнічаў умацаванню складу музейных работнікаў палітычна праверанымі кадрамі, якія маюць дастатковую тэарэтычную падрыхтоўку ў галіне палітыка-асветніцкай работы. Ідэя паставіць музеі на службу сацыялістычнага будаўніцтва была агучана ў снежні 1930 г. у г. Маскве падчас працы Першага Усерасійскага музейнага з'езда [3]. Такім чынам, у гэты перыяд адбываецца пераарыентацыя дзейнасці музея на ідэйна-выхаваўчую і агітацыйную працу. Пры адкрыцці Музея атэізму і гісторыі першабытнай культуры пры БДУ прафесар С.З. Кацэнбоген паведаміў у Аддзел прапаганды і агітацыі Цэнтральнага Бюро КП(б)Б аб «важкім значэнні музея, наогул і ў прыватнасці магчымасці яго выкарыстоўваць у мэтах антырэлігійнай прапаганды, Праўленне Беларускага дзяржаўнага універсітэта ставіць Вас у вядомасць у мэтах найбольшага выкарыстання яго ўсімі падведамнымі Вам навучальнымі ўстановамі і культурна-асветнымі арганізацыямі» [6].

У адпаведнасці з новым падыходам да сістэмы выкладання па-іншаму былі арганізаваны заняткі па дысцыплінах. Яны сталі праходзіць у спецыяльна абсталяваных памяшканнях – кабінетах, лабараторыях, музеях пад строгім кантролем выкладчыкаў. Заслужаны дзеяч навукі БССР, доктар медыцынскіх навук, прафесар С.М. Рубашоў на аснове свайго практычнага вопыту канстатаваў мэтазгоднасць выкарыстання музея, на долю якога выпадае роля «падсумаваць найбольш элементарныя пункты, для таго, каб даць магчымасць выкладчыку спыніцца больш падрабязна на пунктах істотных, сучасных, і, такім чынам, дапамагчы «разгрузцы» выкладання» [16, с. 5].

На тэрыторыі БССР у міжваенны перыяд дзейнічалі наступныя вышэйшыя навучальныя ўстановы [4, с. 254–255]: у г. Мінску – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Педагагічны інстытут, Політэхнічны інстытут, Беларускі дзяржаўны інстытут сельскай і лясной гаспадаркі, Вышэйшая партыйная школа, Медыцынскі інстытут, Інстытут народнай гаспадаркі, Беларуская дзяржаўная кансерваторыя, Інстытут фізічнай культуры; у г. Віцебску – Педагагічны інстытут, Ветэрынарны інстытут, Медыцынскі інстытут; у г. Гомелі – Педагагічны інстытут, Лясны інстытут; у г. Магілёве – Педагагічны інстытут, а таксама Земляробчы інстытут у Горках.

У пералічаных вышэйшых навучальных установах адкрыліся музеі з мэтай павышэння якасці выкладання. Музеі дзейнічалі пры Земляробчым інстытуце ў Горках (Заалагічны музей), пры БДУ (Заалагічны, Мінералогіі і крышталяграфіі, Гісторыі першабытнай культуры і рэлігіі, Гісторыка-археалагічны музеі), пры Мінскім медыцынскім інстытуце (Анатамічны музей), пры Інстытуце сельскай гаспадаркі ў г. Мінску (Агульны музей), пры Віцебскім ветэрынарным інстытуце (Заалагічны, Анатамічны, Паталагаанатамічны музей і інш.), пры Віцебскім педагагічным інстытуце (Заалагічны музей), пры Віцебскім медыцынскім інстытуце (Музей патанатоміі, Анатамічны музей), пры Інстытуце фізічнай культуры БССР (Музей лыж) і інш. Як адзначаў адзін з членаў камісіі пры Мінскім аддзеле народнай адукацыі па арганізацыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Л.Б. Слепян: «усякае жаданне палепшыць пастаноўку школьнай справы і сапраўдным чынам правесці новыя рацыянальныя сістэмы выкладання

застануцца нявырашанымі, пакуль не будзе пакладзены трывалы падмурак для пераўтварэння школы» [7]. На думку вучонага падмуркам з'яўляецца «рабочы педагагічны музей навучальных дапаможнікаў з лабараторыямі, кабінетамі, майстэрнямі і фундаментальнай бібліятэкай, які павінен падрыхтаваць падставу для правільна пастаўленага Вышэйшага Народнага Універсітэта» [7].

Сабраныя ў музеях калекцыі, згодна з прафесарам А.А. Барзовым, складаліся «з уладкавання лабараторый і спецыяльных прыстасаваных кабінетаў і з забеспячэння тых і іншых неабходнымі матэрыяламі і калекцыямі, якія з аднаго боку складаюцца ў навучальныя і навуковыя музеі, а з другога – служаць аб'ектамі навуковай і вучэбнай працы» [8].

Неабходнасць у навучальных матэрыялах з'ўлялася галоўным стымулам для стварэння дадзеных музеяў, дзейнасць якіх выкарыстоўвалася ў цэлым шэрагу навуковых дысцыплін. Фармуючы як вучэбна-дапаможныя падраздзяленні, з мэтай павышэння эфектыўнасці навучальнага працэсу, музеі станавіліся базай для навуковых даследаванняў. Калекцыі, служылі наглядным дапаможнікам у навучальным працэсе, мелі вялікае значэнне для адукацыйнай і даследчай дзейнасці. Напрыклад, у Заалагічным музеі БДУ знаходзілася «каштоўная калекцыя разнастайных прадстаўнікоў жывёльнага царства, галоўным чынам экзотаў, якія маюць для выкладання заалогіі вялікае значэнне, сярод якіх такія каштоўныя асобнікі, як аўстралійскі казуара, серыя калібры і г. д. (...) пудзіла белавежскага зубра» [10], а ў Гісторыка-археалагічным музеі БДУ – «мноства арыгінальных старажытнагрэчаскіх ваз з чорнафігурным і чырвонафігурным роспісам, пліт з надпісамі, шкляных вырабаў, вялікая калекцыя антычных манет і т. д.» [1, с. 4].

Вялікую ўвагу навуковыя работнікі і выкладчыкі надавалі арганізацыі самастойнай работы студэнтаў, у тым ліку і з матэрыяламі фондаў музеяў. Прафесар С.М. Рубашоў казаў аб тым, што музей і «яго аддзелы павінны дапамагчы студэнту пры праглядзе, пасля лекцыі, добра запомніць цэлы шэраг самых элементарных палажэнняў; (...); музей можа дапамагчы ў частцы правядзення Дальтон-плану, так як студэнт можа атрымаць заданне – вывучыць той ці іншы аддзел самастойна па музейных прадметах» [16, с. 7]. Універсітэцкі музей арганічна спалучаў у сабе лабараторыю вучонага і вучэбную аўдыторыю. Пры правільнай арганізацыі якога навукоўцы зыходзілі са становішча, што само выкладанне «не можа быць, нерацыянальна пастаўлена, ні плённа, калі яно не падмацоўваецца аглядам рэальных узораў» [9]. Такім чынам, прадмет трапляў ва ўніверсітэцкі музей таму, што быў «выдзелены» ў сістэме каштоўнасных адносін шэрагу навуковых дысцыплін (медыцыны, заалогіі, батанікі, геалогіі, фізікі, хіміі, археалогіі і г. д.). Музей з'яўляўся калекцыяй «узораў» і такім чынам служыў даведнікам не толькі патрэбам навучальнай установы, але і распаўсюджванню адукацыі і культуры сярод насельніцтва. У 1941 г. рэктар БДУ П.П. Савіцкі ў даведцы «Аб стварэнні і дзейнасці ўніверсітэта» ва Усесаюзны камітэт па справах вышэйшай школы пры СНК СССР пісаў: «за час існавання ўніверсітэт стварыў у сваіх сценах шэраг навукова-навучальных дапаможных устаноў, якія праводзяць акрамя ўсяго вольную працу і па абслугоўванні настаўнікаў, школьнікаў і інтэлігенцыі Беларусі» [2].

Такім чынам, неабходна адзначыць, што ў міжваенны перыяд музеі вышэйшых навучальных устаноў не толькі мелі вялікае значэнне ў станаўленні вышэйшай школы БССР і развіцця ў ёй навуковай базы, але і

занялі важнае месца ў вырашэнні задач народнай асветы і прасоўвання камуністычнай ідэалогіі. У выніку актыўнай перабудовы сістэмы вышэйшай адукацыі, музеі ВНУ трывала ўвайшлі ў вучэбна-навуковую базу, без якой была немагчыма падрыхтоўка маладых спецыялістаў, як тэхнічнага, так і гуманітарнага профілю. Цэнтральнай з'яўлялася задача не проста перадачы вербальнай інфармацыі ад выкладчыка да студэнту, а яе візуалізацыя праз музейны прадмет. У навучэнца фармавалася ўстойлівае ўменне выкарыстоўваць набытыя веды на практыцы. Такім чынам, універсітэцкія музеі ўнеслі вялікі ўклад у развіццё навукі, адукацыі і культуры.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Гісторыка-археалагічны музей у Мінску // Звязда. – 1940. – 8 лют. – № 31. – С. 4.
2. Даведка рэктара БДУ П.П. Савіцкага ва Усесаюзны камітэт па справах вышэйшай школы пры СНК СССР Аб стварэнні і дзейнасці ўніверсітэта // Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт [Электронны рэсурс]. – Режим доступа: https://time.bsu.by/by/bsu-hist/bsu-history/1921-1941/ispytaniya-1930-1941/arkhivnye-dokumenty/560-davedka-rektara-bdu-p-p-savitskaga-va-sesayuzny-kamitet-pa-spravakh-vyshejshaj-shkoly-pry-snk-sssr-ab-stvarenni-i-dzejnastsi-universiteta.html. – Дата доступа: 22.11.2018.
3. Закс, А.Б. Всероссийский музейный съезд / А. Б. Закс // Вопросы истории. – 1980. – №12. – С. 164–167.
4. Красовский, Н.И. Высшая школа Советской Белоруссии / Н. И. Красовский. – Минск : Госиздат БССР. Ред. социал.-экон. лит., 1963. – 255 с.
5. Крупская, Н.К. Библиотечное дело. Избы-читальни. Клубные учреждении. Музеи / Н.К. Крупская. – М. : Директ-Медиа, 2014. – 632 с. [Электронный ресурс]. – http://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=257821 (28.01.2019). – Дата доступа: 13.10.2018.
6. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 4п. – Воп. 1. – Спр. 1168.
7. НАРБ. – Ф. 205. – Воп. 1. – Спр. 1.
8. НАРБ. – Ф. 205. – Воп. 1. – Спр. 17.
9. НАРБ. – Ф. 205. – Воп. 1. – Спр. 1181.
10. НАРБ. – Ф. 205. – Воп. 3. – Спр. 8384.
11. О музейном строительстве в РСФСР : Постановление ВЦИК и СНК РСФСР от 20 августа 1928 г. / Библиотека нормативно-правовых актов Союза Советских Социалистический Республик [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.libussr.ru/doc_ussr/ ussr_3437.htm. – Дата доступа: 13.10.2018.
12. О работе высших учебных заведений и о руководстве высшей школой : Постановление СНК СССР и ЦК ВКП(б) от 23 июня 1936 г. / Библиотека нормативно-правовых актов Союза Советских Социалистический Республик [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.libussr.ru/doc_ussr/ussr_4080.htm. – Дата доступа: 15.10.2018.
13. О реорганизации государственных университетов : Постановление СНК РСФСР от 13 июля 1931 г. № 752 / Библиотека нормативно-правовых актов Союза Советских Социалистический Республик [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.libussr.ru/ doc_ussr/ussr_3748.htm. – Дата доступа: 13.10.2018.
14. О состоянии и задачах музейного строительства : Постановление ВЦИК от 1 января 1934 г. / Библиотека нормативно-правовых актов Союза Советских Социалистический Республик [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.consultant.ru/cons/cgi/online. cgi?req=doc&base=ESU&n=24403#003023187349537126 4. – Дата доступа: 18.11.2018.
15. Патрушева, Г.М. Музеи высших учебных заведений г. Омска и реализация ими образовательно-воспитательной функции на современном этапе / Г. М. Патрушева, О. О. Черникова // Академические и вузовские музеи: роль и место в научно-образовательном процессе: Материалы Всероссийской научной конференции с международным участием. Томск, 7–10 декабря 2008 г. / Отв.редактор Э.И. Черняк. – Томск: Изд-во Том. ун-та, 2009. – 336 с.
16. Рубашев, С.М. Аб вучэбных клінічных музеях / С. М. Рубашев. – Менск: 2-я типлит, БГИ, 1925. – 8 с.